# ЖЫЦЦЁ І СМЕРЦЬ ЧАРВЯКОВА АЛЯКСАНДРА РЫГОРАВІЧА

## 1-ГА СТАРШЫНІ ПРЭЗІДЫУМА ЦВК СССР І БССР

Падрыхтавала Варэнік Вольга Генадзьеўна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
ДУА «Сярэдняя школа № 1 г. Нясвіжа»

# ЖЫЦЦЁ І СМЕРЦЬ АЛЯКСАНДРА ЧАРВЯКОВА

(нарадзіўся 8 сакавіка 1892, в. Дукоркі Ігуменскага павета Мінскай губерніі, цяпер у межах в. Дукора, Пухавіцкі раён — памёр 16 чэрвеня 1937, Мінск) — беларускі і савецкі дзяржаўны дзеяч, партыйны дзеяч РКП(б) і КП(б)Б.



# «ХАЧУ БЫЦЬ НАРОДНЫМ НАСТАЎНІКАМ...»

Біяграфія Аляксандра Чарвякова характэрная для таго часу: нарадзіўся 8 сакавіка 1892 года ў в. Дукоркі Ігуменскага павета Мінскай губерні ў небагатай сям'і. Бацька будучага беларускага дзеяча быў з людзей простых, але ўмеў чытаць і пісаць, чым зарабляў сабе на жыццё. Разумеючы перспектывы адукаванага чалавека, ён з дзяцінства вучыў сваіх дзяцей грамаце. У пошуках заробку бацька вандраваў па дваранскіх маёнтках, аж пакуль не дабраўся да самой Вільні, куды ў хуткім часе перабралася і ўся сям'я. Там будучы беларускі лідар працаваў на будоўлі.

Марай маладога Чарвякова была пасада народнага настаўніка. Для яе ажыццяўлення ён паступіў у Віленскі настаўніцкі інстытут, які скончыў у 1915 годзе, здаўшы экзамены экстэрнам. Пасля навучання ён паехаў у Троцкі павет вучыць дзяцей літоўскіх сялян. За хуткі час Чарвякоў стаў сваім чалавекам сярод мясцовых.

# НЕАБЫЯКАВЫ ДА ПАЛІТЫКІ

Тагачасная сістэма адукацыі прадугледжвала навучанне толькі на адной мове – расійскай, але Чарвякоў для лепшай камунікацыі з вучнямі вывучыў польскую і літоўскую, якімі карыстаўся і на занятках. За гэта ён атрымлівае статус “нядобранадзейнага”. Магчыма, менавіта ў той час аформіліся яго погляды адносна нацыянальнай культуры, прычым не толькі беларускай.

Як і многія прадстаўнікі інтэлігенцыі, а настаўнікі ў прыватнасці, Чарвякоў быў неабыякавы да палітыкі. Ён актыўна займаецца ёй, ахвяруючы ўласным часам. У 1917 годзе Чарвякоў быў адным з арганізатараў і кіраўнікоў Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі, якая брала актыўны ўдзел у працы Першага Усебеларускага з’езду, выступаючы за самавызначэнне Беларусі на савецкай аснове. Нягледзячы на гэта, ён быў добра знаёмы і падтрымліваў прыяцельскія стасункі з “правымі”, якія выступалі за абвяшчэнне незалежнай беларускай рэспублікі. Падчас разгону з’езду Чарвякоў нават быў затрыманы разам з іншай нацдэмаўскай публікай бальшавікамі. Не разабраліся, відаць.

# БЛІСКУЧАЯ КАР'ЕРА

Па бальшавіцкіх мерках Аляксандр Чарвякоў зрабіў бліскучую і імклівую кар'еру. Глядзіце самі: у 1918 годзе ён займае пасаду камісара Беларускага нацыянальнага камісарыята ў Петраградзе, праз год уваходзіць у першы урад БССР, абвешчанай у Смаленску, а ў 1920 годзе будзе абраны старшынёй СНК і ЦВК БССР. Апошнюю пасаду Чарвякоў будзе займаць да самай сваёй смерці ў 1937 годзе. Менавіта займаючы яе, ён паспее зрабіць надзвычай шмат для сваёй краіны.



# МАЛАДЫ КІРАЎНІК БЕЛАРУСІ

Адным з першых крокаў, які зрабіў малады кіраўнік Беларусі, была спроба наладзіць сувязі з эміграцыяй. Разумеючы неабходнасць у кваліфікаваных кадрах, ужо ў лютым 1921 года ЦВК Беларусі звяртаецца да землякоў, якія жывуць за мяжой, з прапановай вярнуцца на Радзіму. На запрашэнне Чарвякова адгукаюцца многія вядомыя беларускія дзеячы, у тым ліку Вацлаў Ластоўскі. Пачынаецца сапраўднае беларускае Адраджэнне, вялікія грошы вылучаюцца на развіццё беларускай культуры, з'яўляюцца першыя ўстановы культуры і адукацыі.

Але не мовай адзінай. Сабраўшы каманду паплечнікаў, Аляксандр Чарвякоў удала рэалізуе праграму эканамічнага развіцця Беларусі, распрацоўваецца нават самастойная канцэпцыя "Беларусь – чырвоная Данія", якая ўяўляла сабой шэраг мераў па развіцці невялікіх прыватных гаспадарак. У 1920-я гады эканамічныя тэмпы Беларусі апярэджвалі нават РСФСР.

# ВОЛЬНАСЦІ НЕ ДАРУЮЦЬ!

Менавіта за Чарвяковым Савецкая Беларусь пачала прырастаць забранымі тэрыторыямі. Літаратуразнавец Язэп Янушкевіч згадвае нават пра “мангольскі праект”, які прадугледжваў выхад БССР са складу СССР і стварэнне “незалежнай” ад яго краіны для вяртання Заходняй Беларусі. Беларускія ж нацыянал-камуністы хацелі скарыстацца ім, каб адарваць Беларусь ад савецкай імперыі.

Але нядоўга музыка іграла. Зразумела, што такія вольнасці не маглі застацца без увагі з боку цэнтра. Барацьба з іншадумствам пачалася ў 1929 годзе, пасля знакамітага выступу Сталіна на красавіцкім пленуме ВКП(б), на якім абвяшчалася пра “вырашальны паварот ва ўсёй нашай палітыцы”. Павярнулі, так павярнулі, што многія дагэтуль вывернуць не могуць.

У той жа год пачынаецца барацьба з “правым” ухілам у партыі, згортваецца ранейшая эканамічная палітыка, па ўсёй краіне адбываюцца арышты і суды. У 1930 будзе сфабрыкава ная справа “Саюза вызвалення Беларусі”, па якой арыштуюць 108 чалавек, а старшыню ЦВК абвінавацяць у сувязях з яго сябрамі, а таксама ў нацдэмаўшчыне, апартунізме і шавінізме.

# КРЫВАВЫ 1937-Ы



У межах сваёй кампетэнцыі Чарвякоў працягвае праводзіць незалежную палітыку. Спіс "грахоў" перад партыяй робіцца ўсё большым. Апагеем стаў крывавы 1937 год, калі па ўсёй краіне, дзе так вольна дыхае чалавек, пракацілася чырвонае кола рэпрэсій. Абсалютная большасць "айцоў-заснавальнікаў" БССР альбо апынулася за кратамі, альбо была прыгаворана да найвышэйшай меры сацыяльнай абароны. Такой прыгожай фармулёўкай назвалі бальшавікі расстрэл.

# «ВОРАГ НАРОДА»

Кропка ў жыцці Аляксандра Чарвякова была пастаўленая падчас працы XVI з’езду КП(б)Б 16 чэрвеня 1937 года, на якім ён быў падвергнуты рэзкай крытыцы з боку аднапартыйцаў. Яго абвінавацілі ва ўсіх смяротных грахах бальшавіка: недастатковай барацьбе з ворагамі, палітычных памылках, сувязях з нацдэмамі ды іншымі шкоднікамі. Усе чакалі чарговага прызнання і пакаяння, а таксама новых фактаў з жыцця старшыні. Тады такія публічныя сеансы “псіхатэрапіі”, якія заканчваліся арыштам і судом назаўтра, практыкаваліся ва ўсіх куточках вялікай краіны.

Не дачакаліся. Рэвалюцыянер са стажам і паспяховы палітык, апынуўшыся фактычна ў безвыходнай сітуацыі, выбірае добраахвотны сыход з жыцця. Ён замыкаецца ва ўласным кабінеце і стрэлам у сэрца з табельнай зброі абрывае сваё жыццё.

# АПОШНЯЕ МЕСЦА ПРЫТУЛКУ




Чарвякова не ўдалося ціхенька пахаваць, як гісторыка Усевалада Ігнатоўскага, які аналагічным чынам скончыў сваё жыццё. Два дні да труны памерлага ішлі людзі. Неслі кветкі. Беларусь развітвалася з сваім лідарам. Тым не менш у спіс ворагаў народу ён усё ж паспеў трапіць.

Такой, відаць, была падзяка ад таварышаў па партыі за ўсё зробленае.

# УШАНАВАННЕ ПАМЯЦІ

У 1967 годзе ў гонар Аляксандра Чарвякова названая вуліца і завулак у Цэнтральным раёне горада Мінска.

Таксама ў яго гонар названа вуліца на радзіме ў аг. Дукоры, яго імём названа Свіслацкая сярэдняя школа Пухавіцкага раёна, дзе створаны прысвечаны яму музей, на доме ў Мінску, дзе ён жыў, устаноўлена мемарыяльная дошка.



# В.БЫКАЎ «ЗНАК БЯДЫ»




У «Знаку бяды» Васіля Быкава ёсць 22-гі раздзел. У ім апавядаецца, як у хату да Петрака і Сцепаніды Багацькаў з перамеценай снегам дарогі завіталі тры мужчыны: малады цывільны, старэйшы цывільны, лысы ды з вусікамі, і чырвонаармеец. А ў хаце ў Багацькаў нелады: хлеба добрага няма, бо жыта вобмаль, і Сцепаніда дамешвала ў цеста бульбу і вотруб’е; добрых дроў няма — сырая алешына; дачка хворая, нездаровы і сын, а тут яшчэ такі мароз, што вада ў калодзежы замерзла… Пакуль расчышчалі дарогу, госці атайбаваліся ў хаце. З гаспадарамі гаманіў маладзейшы цывільны.

# В.БЫКАЎ «ЗНАК БЯДЫ»

«Пятрок падумаў, што, мабыць, гэты старэйшы па ўзросту, а можа, і па пасадзе штось скажа, але ён не сказаў нічога, усё моўчкі сядзеў пры стале, пазіраючы ў грубку. На ягоным твары ляжаў адбітак задуменнай нерухомасці, стомы, бы ад якой глыбокай заклапочанасці. Здавалася, ягоная ўвага была скіравана кудысьці далёка ў нейкія свае клопаты, і ў гэтай хаце нішто яго не цікавіла».

Ён, гэты старэйшы, трохі загамоніць, калі перад адыходам з хаты дасць Сцепанідзе чырвонец «на малако і лякарства» для ейнае хворае дачкі, калі падзякуе Петраку за абагрэўку ды пажадае здароўя ягонай дачцэ, а на развітанне скажа: «То багатага жыцця, таварыш Багацька».



# В.БЫКАЎ «ЗНАК БЯДЫ»



Тая сустрэча ў хаце Багацькаў адбылася на пачатку 1937-га, перад Вадохрышчам, а ўлетку Пятрок паездзе ў Менск (яшчэ Менск), каб аддаць доўг ды папрасіць таго старэйшага вызваліць арыштаванага старшыню іхняга калгаса. Ад міліцыянера ж, які пільнаваў уваход у Дом урада, Пятрок пачуў: «Памёр Чарвякоў».

Міліцыянер сказаў Петраку няпраўду. Калі ён вернецца дахаты, дык, пэўна, пачуе ад землякоў штосьці іншае, бо на 4-й старонцы «Звязды» за 17 чэрвеня ў раздзеле «Хроніка» дробнымі літарамі і без жалобнай рамкі была надрукаваная нататка:

«Старшыня ЦВК Беларускай ССР А. Г. Чарвякоў 16-га чэрвеня пакончыў жыццё самагубствам на асабістай сямейнай глебе».

Цяпер няпраўду сказалі ўсяму беларускаму народу.

# «БАГАЦЕЙ, СЕЛЯНІН...»



Уклаўшы ў вусны Аляксандра Чарвякова словы «то багатага жыцця, таварыш Багацька», Васіль Быкаў ведаў, што рабіў. Бо гэта ён, старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР, у маі 1925-га на VII з’ездзе Саветаў БССР прамовіў знакамітыя словы: «Багацей, селянін, здабывай больш багацця, і чым больш ты будзеш багаты, тым больш багата будзе наша Савецкая рабоча-сялянская дзяржава».

# ГІСТАРЫЧНАЯ АСОБА Ў «ЗНАКУ БЯДЫ»

Заклікаючы сялян багацець, Чарвякоў з аптымізмам глядзеў у будучыню. Завітаўшы праз 12 гадоў пасля тае знакамітае прамовы ў бедную хату Багацькаў, пра што ён маўчаў і думаў, якія рахункі падводзіў?..

Васіль Быкаў не думаў за Чарвякова і не выкладаў тыя думкі на паперы, а даў кожнаму з нас, чытачоў, магчымасць дадумаць. І зразумець трагізм сітуацыі, у якой апынуўся старшыня ЦВК БССР у 1937-м.

